## САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ Ў ДЗЕЙНАСЦІ СУЧАСНЫХ КЛУБНЫХ УСТАНОЎ

Неабходнасць сацыяльна-культурных пераўтварэнняў у дзейнасці сучаснай клубнай установы абумоўлена шэрагам гістарычных, ідэалагічных і сацыяльных перамен, якія адбыліся ў жыцці нашай краіны, а таксама еўрапейскага супольніцтва. Да апошняга часу клубная ўстанова амаль цалкам адпавядала тэарэтычнай мадэлі, распрацаванай яшчэ ў 30-я гады. Яна была прызначана ўздзейнічаць на асобу, ствараць яе па ідэйна-палітычным канонам і тым самым актыўна ўдзельнічаць у працэсе будаўніцтва сацыялістычнай дзяржавы. Гэтыя тэарэтычныя падыходы і прынцыпова важкія для таго часу палажэнні аб клубных установах на дзесяцігоддзі замацаваліся ў якасці галоўных арыентыраў у арганізацыі ўсёй сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Ідэалагічны кантроль, які ажыццяўляўся да нядаўняй пары ў галіне культуры, знайшоў сваё адлюстраванне і ў дзяржаўным рэгуляванні культурнай сферы вольнага часу. Гэта прывяло да вельмі абмежаванага выбару з боку грамадзян сродкаў і форм культурнай дасугавай дзейнасці. Патрабаванні ідэалагічнага характару і погляды на асобу як функцыянальную адзінку унітарнай грамадскай сістэмы, прыўнясенне ў паняцце «вольны час» неўласцівых яму функцый прывялі да скажонага разумення вольнага часу, яго грамадскай ролі, да практыкі арганізацыі яго з арыентацыяй хутчэй на адміністратыўна-дзяржаўныя мэты, чым на рэальныя інтарэсы і запатрабаванні асобы, і ў выніку — адчужэння людзей ад культурна-творчай дзейнасці.

На рубяжы 80—90-х гадоў у практыцы функцыянавання клуба як аднаго з сацыяльных інстытутаў назіраліся негатыўныя тэндэнцыі ў арганізацыі вольнага часу: зніжэнне актыўнасці наведвання ўстановы; неадпаведнасць форм клубнай работы патрабаванням грамадства; абмежаваная колькасць культурных паслуг, прапануемых насельніцтву з боку клубных устаноў; незадаволенасць значнай часткі жыхароў рэгіёнаў зместам культурнага абслугоўвання, нізкім узроўнем матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння сацыяльна-культурных праграм і інш. Недастатковы ўзровень навукова-тэарэтычнага асэнсавання сацыяльнай ролі клубнай установы ў рэальных культурных працэсах і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

плынях не дазваляў глыбока і сур'ёзна вызначыць сапраўдныя прычыны крызісу ў справе развіцця культурнай сферы вольнага часу і практыцы дзейнасці яе інстытутаў. Тым не менш, можна адзначыць, што крызісны стан галіны ў значнай ступені тлумачыцца існуючым разрывам паміж сутнаснымі характарыстыкамі культурнай дзейнасці ў вольны час і ідэямі клуба, што панавалі на рубяжы 80—90-х гадоў, неадпаведнасцю сацыяльна-культурнага заказу з боку грамадства і наборам тых культурных паслуг, якія яшчэ і сёння прапануе клуб. Адпаведна з мадэллю 30-х гадоў клуб разглядаўся пераважна ў межах ідэалагічнай структуры грамадства. У меншай ступені (на ўзроўні грамадскай думкі) клуб успрымаўся як сацыяльны інстытут культуры, галоўнае прызначэнне якога — садзейнічанне працэсу засваення, стварэння і распаўсюджвання культурна-эстэтычных каштоўнасцей.

У поглядах на дзейнасць клуба назапасіўся пэўны набор стэрэатыпаў і міфаў. Адзін з міфаў — неабмежаваныя магчымасці клуба ў вырашэнні эканамічных, вытворчых, палітычных і іншых праблем грамадства. Другі міф — праз клуб можна кіраваць развіццём нацыянальнай культуры і ўплываць на стан грамадства ўвогуле. Яшчэ адзін міф — непамернае завышэнне магчымасцей і ролі клуба ў выхаванні асобы. Пераадолець і пераасэнсаваць некаторыя з такіх міфаў, пазбавіцца ад іх — адна з галоўных задач сацыяльна-культурнага пераўтварэння дзейнасці клуба.

Аналіз асноўных тэндэнцый і паказчыкаў культурнай дзейнасці насельніцтва ў сферы вольнага часу дазваляе сцвярджаць, што за апошнія 20 гадоў (1980—1999 гг.) адбыліся вельмі значныя змены ў характарыстыках сацыяльна-культурнай дзейнасці ва ўсіх яе відах і формах вызначэння. Дзейнасць клубаў таксама істотна змянілася, аднак дынаміка змен у сацыяльна-культурнай дзейнасці і наяўнасць культурных патрабаванняў новага ўзроўню пакуль што не знайшлі свайго поўнага забеспячэння, не прывялі да якаснай структурна-функцыянальнай перабудовы.

Складаны эканамічны і палітычны этап, на якім знаходзіцца ў цяперашні час наша краіна, працэсы нацыянальна-культурнага будаўніцтва і дэмакратызацыі ўсіх бакоў жыццядзейнасці грамадства з'явіліся каталізатарамі змяненняў, што адбываюцца ў сацыяльна-культурнай сферы. Трэба адзначыць, што ў сучасны перыяд сутнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржаўнай палітыкі ў сферы вольнага часу, у асноўным, вызначана ў шэрагу заканадаўчых актаў: законах «Аб культуры ў Беларускай ССР», «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб грамадскіх арганізацыях у Рэспубліцы Беларусь», а таксама ў асобных артыкулах Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаўных дакументах, якія забяспечваюць дастаткова высокую ступень свабоды культурна-творчай дзейнасці грамадзян, даюць магчымасць сацыяльна-арганізацыйнага эксперыментавання. Між тым, далейшая распрацоўка канцэптуальных асноў і праграмных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці па-ранейшаму застаецца вельмі актуальнай праблемай.

У апошнія гады ў нашым грамадстве некалькі павялічыўся аб'ём літаратуры, прысвечанай праблемам далейшага развіцця культурнай сферы вольнага часу, адзначаюцца спробы навукоўцаў пераасэнсаваць шэраг пытанняў, звязаных з забеспячэннем функцыянавання розных аб'ектаў і сістэм: рэкрэацыйна-аздараўленчых, камунікатыўных, забаўляльна-адукацыйных і г. д. Заўважым, што менавіта беларускія сацыёлагі яшчэ ў пачатку 80-х гадоў вызначылі неабходнасць вывучаць заканамернасці, што існуюць у культурнай сферы вольнага часу, якую яны разглядаюць як сістэмна-арганізацыйную галіну, як частку сацыяльнай інфраструктуры грамадства. Так, у першым выданні па прыкладной сацыялогіі беларускія навукоўцы адзначаюць, што, абапіраючыся на агульныя законы прыкладной сацыялогіі, бачыцца магчымым высвятліць асаблівасці сацыяльных працэсаў і з'яў, якія адбываюцца ў культурнай сферы вольнага часу, калі разглядаць яго ў якасці адносна самастойнай сацыяльнай сістэмы грамадскага жыцця. Веданне гэтых законаў і асэнсаванне культурных плыняў, якія звязаны з развіццём іншых структур грамадскага жыцця, дазваляюць вызначыць больш мэтазгодныя падыходы да рэгулявання і кіравання сацыяльных інстытутаў у галіне культуры, сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сферы вольнага часу. Зразумела, што станаўленне сацыяльных інстытутаў культуры, як і далейшае развіццё клуба ў якасці ўстановы культуры, не ўяўляецца магчымым без асэнсавання дынамікі сацыяльна-культурных рухаў і тэндэнцый у развіцці культуры, што адбываюцца ў еўрапейскіх і іншых краінах свету,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

без глыбокага аналізу ўплыву сацыяльна-культурных фактараў на характар дзейнасці сацыяльных інстытутаў культуры.

Абапіраючыся на тэарэтычную базу айчыннай і замежнай культуралогіі, аналізуючы вопыт сацыялагічных даследаванняў шляхоў станаўлення і развіцця сферы вольнага часу як часткі жыццядзейнасці грамадства, абагульняючы дасягненні тэарэтычнай думкі аб асаблівасцях функцыянавання розных сацыяльных інстытутаў культуры ў сучасны перыяд, можна вызначыць асноўныя тэндэнцыі, якія характарызуюць дынаміку культурнага жыцця грамадства напрыканцы стагоддзя і, як след, вызначаюць і абумоўліваюць станаўленне клубных структур на будучыню. Разгледзім некаторыя з іх.

***Уплыў павелічэння колькасці спажывецка-забаўляльных установак на характар зносін з культурнымі каштоўнасцямі.***

Шматлікія даследаванні, матэрыялы навуковых канферэнцый, міжнародных сімпозіумаў і г.д. сведчаць аб наяўнасці ў сучасным еўрапейскім грамадстве спажывецкага настрою ў адносінах да культуры ўвогуле. Не выключэнне і працэс засваення культурна-эстэтычных каштоўнасцей ва ўмовах нерэгламентаванай, добраахвотнай, вольнай дзейнасці, што задавальняецца непасрэдна праз установы і арганізацыі культурнай сферы вольнага часу, у тым ліку і сучаснага клуба. Наш сучаснік лічыць за лепшае сузіраць мастацкую культуру, а не ствараць; спажываць культурныя каштоўнасці без праяўлення актыўнасці і асабістай творчасці; прымаць культурную паслугу, а не праяўляць ініцыятыву, актыўнасць пры наяўнасці задавальнення рэкрэацыяй. Прыкладамі ўвасаблення гэтай тэндэнцыі з'яўляюцца тэлевізійныя праекты «Угадай мелодию», «Поле чудес», «Два рояля», японскі праект «Караоке». У дзейнасці сучасных клубных устаноў Беларусі гэтая тэндэнцыя назіраецца ў адпаведным пасіўным клубным фоне большасці праграм і мерапрыемстваў. Такім чынам, можна фіксаваць, што ў пэўнай ступені зніжаецца актыўнасць насельніцтва ў праяўленні культурных інтарэсаў і запатрабаванняў. Дзейнасць жа клубных устаноў усё больш набывае характар культурных паслуг насельніцтву, арыентаваных на забаўляльныя патрэбы спажыўца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Паступовы працэс стандартызацыі ладу жыцця і тыражыраванне тыповых відаў і форм аматарскай дзейнасці, мадэляў сацыяльна-культурнай актыўнасці ў сферы вольнага часу.***

Пад уздзеяннем сродкаў масавай інфармацыі, у першую чаргу — тэлебачання, фарміруюцца стандартныя ўяўленні аб прынятым «наборы» культурных захапленняў. Папулярызацыя аматарскай дзейнасці звязана з сучаснай тэхнікай, галоўным чынам — з камп'ютэрамі. Напрыклад, каля 6000 камп'ютэрных праграм пастаўлена на рынак спажыўца, у выніку чаго ўвесь свет карыстаецца аднымі праграмамі і гульнямі.

Агульнавядома, што сфера вольнага часу дае магчымасць асабістага, індывідуальнага выбару сродкаў, спосабаў і форм дзейнасці. Толькі гарадская культура, як сведчаць сацыялагічныя даныя, прапануе чалавеку каля 500 розных відаў культурна-творчай дзейнасці. Аднак спектр засвоеных, напрыклад, моладдзю налічвае іх пакуль што толькі каля ста.

Усё больш звужваецца кола аматарскіх захапленняў. У моладзі гэта — дыскатэка, начны клуб, тусоўка. Назіраючы за дзейнасцю клубных устаноў рэспублікі, фіксуем наяўнасць гэтай тэндэнцыі паўсюдна ў рэгіёнах: стандартны набор праграм, клубных фарміраванняў, тыповых мадэляў паводзін і г.д. Пад уплывам тэлебачання выкарыстоўваюцца амаль адзіныя забаўляльныя, рэкрэацыйна-гульнёвыя праграмы, трафарэтныя схемы канцэртаў і відовішчаў. Такіх прыкладаў можна прывесці шмат.

***Узмацненне індывідуальнага фактару пры выбары відаў аматарскай дзейнасці, форм арганізацыі вольнага часу, зместу яго запаўнення.***

Назіраецца ўстаноўка на самапраяўленне і самавызначэнне, не столькі на сумесную калектыўную творчасць, колькі на асобасны кантакт з мастацтвам праз аматарства: выяўленчае мастацтва, народныя промыслы, дызайн, бардаўская песня, сольныя народныя і эстрадныя спевы. У дзейнасці клубных устаноў таксама даволі яскрава праяўляецца гэтая тэндэнцыя. Наўрад ці можна чакаць развіцця масавых форм клубнай дзейнасці: у мастацкай самадзейнасці назіраецца рост камерных калектываў і студый

сольных спеваў, тэатраў мініяцюр і інш.; конкурсы індывідуальных выканаўцаў — спевакоў, музыкантаў, танцораў — прывабліваюць значную аўдыторыю.

***Пастаянна ўзрастаючае значэнне вольнага часу як грамадскай каштоўнасці востра ставіць перад даследчыкамі пытанне аб неабходнасці асэнсавання розных аспектаў праблемы чалавечых зносін і іх ролі ў развіцці асобы ва ўмовах сацыяльна-культурнай дзейнасці.***

Даволі распаўсюджанай з'яўляецца думка аб тым, што менавіта духоўныя зносіны на аснове асабістых, нерэгламентаваных кантактаў у сферы вольнага часу — гэта і ёсць той самы вузел, у якім сканцэнтраваны шматлікія тэарэтычныя і практычныя пытанні дзейнасці ўстаноў і арганізацый культурнай сферы вольнага часу.

Расшырэнне і паглыбленне культурных кантактаў у сферы вольнага часу абумоўлены патрабаваннямі грамадства, а працэс дэмакратызацыі грамадства напрыканцы XX ст. спрыяе інтэнсіфікацыі зносін паміж суб'ектамі культурнай дзейнасці, павышае патрабаванні да зместу зносін, форм іх арганізацыі, да павышэння выхаваўчай эфектыўнасці межасобасных кантактаў, якія ажыццяўляюцца ў працэсе сацыякультурнай дзейнасці.

Зразумела, што рост кантактаў у сферы вольнага часу — гэта адлюстраванне тых змен, што адбываюцца ў сацыяльна-культурным жыцці грамадства ў цэлым, бо само грамадства і ёсць сістэма сацыяльных сувязяў паміж людзьмі. Феномен гэтых сувязяў у тым, як сцвярджаюць вядомыя навукоўцы Ю.М.Брамлей і Р.Г.Падольны, што, чым больш складаныя, шматбаковыя і інтэнсіўныя зносіны паміж людзьмі, тым болей развіта чалавечае грамадства, тым больш развітую культуру засвойваюць людзі ў працэсе гэтых зносін.

Культурна-асветныя ўстановы па свайму сацыяльнаму прызначэнню, як мы ўжо адзначалі, служаць перш-наперш месцам духоўных зносін. Таму далейшае развіццё ўстаноў культуры сферы вольнага часу звязана з функцыянаваннем розных сацыяльна-культурных суполак, фарміраванняў па захапленнях, шматлікіх клубных аб'яднанняў, якія маюць вялікія патэнцыяльныя магчымасці ў за-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

давальненні патрабаванняў і інтарэсаў грамадзян непасрэдна праз арганізацыю нефармальных міжасобасных зносін. Некаторыя з даследчыкаў лічаць, што ўвогуле спецыфічнымі функцыямі клуба назаўсёды застаюцца арганізацыя змястоўных цывілізаваных кантактаў і павышэнне культуры зносін у грамадстве, што забяспечвае непасрэднае рэгуляванне суадносінамі паміж людзьмі, іх сацыяльнымі паводзінамі ў сферы вольнага часу і ў іншых формах жыццядзейнасці. На думку некаторых тэарэтыкаў, клубная дзейнасць будуецца, галоўным чынам, на аснове шматлікіх форм і мадэляў зносін. Трэба таксама падкрэсліць, што ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыі паўстае іншая задача, якую адзначаюць як тэарэтыкі, так і практыкі, — вызначыць і вывучыць спецыфіку сродкаў, спосабаў і метадаў рэгуляцыі сацыяльных паводзін асобы, малой ці вялікай сацыяльнай групы ў межах сумеснай культурна-займальнай дзейнасці.

***Змена выхаваўчай парадыгмы, у якой у значнай ступені пераасэнсавана сутнасць выхавання, развіцця, увогуле духоўнага станаўлення асобы.***

«Як эфектыўней уздзейнічаць на чалавека» — так было пастаўлена адно з галоўных пытанняў тэорыі і практыкі выхаваўчай работы. На гэтым палажэнні грунтавалася ўся тэорыя і практыка клубнай дзейнасці амаль да апошняга часу. Само выхаванне разумелася не інакш, як працэс мэтанакіраванага, сістэматычнага фарміравання асобы ў мэтах падрыхтоўкі яе да актыўнага ўдзелу ў грамадскім, вытворчым, сацыякультурным жыцці. Паводле існуючых ідэалаў сацыялістычнага грамадства, асноўнай мэтай выхавання чалавека было вызначана фарміраванне ў яго сацыяльна важкіх асабістых якасцей, што выражаюцца ў камуністычным светапоглядзе, устаноўках і навыках паводзін у інтарэсах рэалізацыі задач па стварэнню новага грамадства ў краіне.

Для гуманістычнай педагогікі прынцыпова важным з'яўляецца адказ ад маніпуляцыі чалавекам у імя якіх бы там ні было мэт і ідэалаў. Чалавек заўсёды ёсць мэта, але ніколі не сродак — так мяркуюць і тэарэтыкі, і практыкі, якія прытрымліваюцца пазіцый гуманістычнай навукі. Прынцыпова важным з'яўляецца разуменне гуманізму як сістэмы поглядаў, што ў цэнтр ставіць патрабаванні і інта-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэсы чалавека, дасягненне чалавечага шчасця, паляпшэнне жыцця зараз і для кожнага. Як адзначае адзін з паслядоўнікаў гуманізму П.Курц, гуманізм цесна звязаны з культурнымі пераўтварэннямі грамадства шляхам развіцця адукацыі і дэмакратызацыі.

Развіццё асобы немагчыма без дэмакратыі, як і дэмакратыя немагчыма без асоб, маючых карысны для грамадства патэнцыял, — такі пастулат сёння не выклікае сумнення, на гэтай пазіцыі будуюцца навука і практыка выхавання чалавека-гуманіста, чалавека-творцы, грамадзяніна дэмакратычнага грамадства.

Выхаванне ў сацыяльна-культурнай сферы, зыходзячы з пазіцый гуманістычнай педагогікі, у самым шырокім сэнсе ёсць спецыяльна арганізаваныя зносіны паміж людзьмі з мэтай развіцця іх індывідуальнасці, самацэннасці, самабытнасці.

***Пэўная стабілізацыя аўдыторыі мастацтва і мастацкай дзейнасці, рост патрэбы ў жывым кантакце з мастацтвам*** (колькасць прыхільнікаў мастацтва — каля 63% ад агульнай колькасці насельніцтва застаецца адносна пастаяннай на працягу апошніх 20 гадоў).

Менавіта тут можна ўбачыць пэўную перспектыву развіцця самадзейнай мастацкай творчасці. Адзначым, што апошнія падзеі ў культурным жыцці нашай краіны такія, як І Нацыянальны фестываль «Беларусь — мая песня» — таксама сведчаць аб тым, што народная творчасць карыстаецца значным попытам, мае сваю аўдыторыю, значныя дасягненні ў выканаўчым майстэрстве і г.д.

***Актывізацыя грамадскага інтарэсу да гістарычна-культурных традыцый народаў.***

Зварот да вытокаў нацыянальнай культуры і адраджэння ў сучасным культурным жыцці традыцыйных узораў народнай творчасці, асэнсаванне гістарычных паданняў, развіццё культуры, кожнай з яе сфер — гэта натуральны працэс, які назіраецца ў розных еўрапейскіх дзяржавах. Напрыканцы XX ст. ён набывае асаблівы сэнс і культуралагічную каштоўнасць. Вяртанне да культурна-гістарычных традыцый на Беларусі — адзін з найбольш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актыўных сацыяльна-культурных працэсаў, што адбываецца паўсюдна ў розных рэгіёнах.

У гэтым сэнсе сучасны клуб выдзяляецца ў якасці аднаго з галоўных сацыяльных інстытутаў, прызначаных забяспечыць захаванне і развіццё нацыянальных, этнічных, увогуле народных традыцый, звычаяў, усёй культурнай спадчыны. Сучасная практыка вымагае ад навукоўцаў абгрунтаваных праектаў развіцця культурнай сферы вольнага часу з улікам рэгіянальна-нацыянальных і культурна-гістарычных асаблівасцей.

***Пры наяўнасці агульных тэндэнцый у сферы вольнага часу развіццё розных форм культурнай дзейнасці ў рэгіянальным плане адбываецца неаднолькава.***

Вызначэнне прыярытэтных напрамкаў развіцця нацыянальнай культуры, пошук і ўкараненне новых праектаў і мадэляў сацыяльна-культурнага жыцця насельніцтва асабліва актуальныя на рэгіянальным узроўні. Відавочна, што менавіта ў рэгіёне сёння складаецца ўласная стратэгія развіцця сферы вольнага часу з улікам сацыяльна-эканамічных і культурна-гістарычных асаблівасцей раёна, культурнага патэнцыялу, патрабаванняў і інтарэсаў грамадзян. Праблемы стварэння арганізацыйна-эканамічных умоў для самаразвіцця культурнай сферы вольнага часу, пошук новых падыходаў да вызначэння асноў культурнай палітыкі павінны вырашацца на рэгіянальным узроўні з улікам сацыяльна-эканамічных асаблівасцей рэгіёна, інтарэсаў і культурных патрабаванняў розных катэгорый насельніцтва, культурнага патэнцыялу дадзенай тэрыторыі. Рэгіянальны падыход да кіравання культурнай сферай вольнага часу дазваляе вызначыць залежнасць яе развіцця ад іншых сацыяльных структур, асноўныя заканамернасці яе функцыянавання ў сучасных умовах. У значнай ступені гэта дапамагае зразумець агульны стан і асаблівасці развіцця вольнага часу ў розных рэгіянальных умовах (сталіца, абласны цэнтр, малы горад, малады горад, пасёлак гарадскога тыпу, вялікая вёска, малая вёска і г.д.).

***Нарастанне матэрыяльна-прагматычных інтарэсаў насельніцтва ў сферы вольнага часу (аматарская дзейнасць як сродак дадатковага заробку, арганізацыі***



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

***вольнага часу ў клубе з мэтай набыцця практычных ведаў і ўменняў, нават другой кваліфікацыі).***

Эканоміка вольнага часу патрабуе паступовага развіцця прыбытковых рэнтабельных форм гаспадарання, якія б, па-першае, дазволілі больш эфектыўна выкарыстоўваць дзяржаўныя сродкі і, па-другое, удасканальваць практыку самафінансавання ўстаноў культуры клубнага тыпу. Задавальненне гэтых існуючых патрабаванняў насельніцтва выклікае неабходнасць пераасэнсавання розных відаў платных паслуг, камерцыйных падыходаў, набору заняткаў па прыкладных відах аматарскай дзейнасці і г.д.

Такім чынам, далейшае развіццё культурнай сферы вольнага часу і клуба як аднаго з сацыяльных інстытутаў, функцыяніруючых у гэтай сферы, не ўяўляецца магчымым без усебаковага аналізу гэтай сферы, яе сучаснага стану, тых працэсаў і рухаў, што адбываюцца ў дзейнасці арганізацый і ўстаноў культуры. Бачыцца неабходным правядзенне спецыяльных сацыялагічных даследаванняў для больш глыбокага і дэталёвага вывучэння праблем дзейнасці ўстаноў культуры клубнага тыпу ў сучасных сацыяльна-культурных і эканамічных умовах з улікам рэгіянальных, пасяленчаскіх і мясцовых традыцый і асаблівасцей.

Наяўнасць шматлікіх, нават процілеглых, сацыяльна-культурных тэндэнцый розных культурных працэсаў і плыняў патрабуе ўнясення значных карэктываў у дзейнасць клубнай установы на Беларусі.

Такім чынам, найбольш актуальнымі пытаннямі функцыянавання клубаў у рэспубліцы, як сведчаць аналіз сучасных канцэптуальна-тэарэтычных распрацовак, прысвечаных развіццю сацыяльна-культурных працэсаў у грамадстве, вынік сацыялагічных даследаванняў дзейнасці сацыяльных інстытутаў культуры, а таксама абагульненне стану клубнай практыкі ў розных рэгіёнах рэспублікі, з'яўляюцца наступныя:

— асэнсаванне ўплыву сацыякультурных фактараў на функцыянаванне клубнай установы як грамадскага інстытута;

— выяўленне актуальных задач сучаснай культурнай палітыкі ў адносінах да ўсёй сацыякультурнай дзейнасці, ажыццяўляемай непасрэдна ў сферы вольнага часу ў рэспубліцы;

— аналіз змяненняў у мэтавых арыентацыях дзейнасці клуба як суб'екта дзяржаўнай культурнай палітыкі;

— выяўленне шляхоў станаўлення і развіцця клуба як аднаго з найбольш распаўсюджаных на Беларусі сацыяльных інстытутаў культуры;

— вызначэнне механізмаў і метадаў функцыянальна-структурнага рэфармавання дзейнасці клубаў у адпаведнасці з сацыякультурнымі арыенцірамі развіцця грамадства.

Паўсюдна ў рэгіёнах рэспублікі ажыццяўляецца працэс рэфармавання клубных устаноў, іх прафілізацыі і спецыялізацыі. Назапашаны цікавы вопыт, і прыкладам таму могуць быць установы культуры Вілейскага і Маладзечанскага раёнаў, у якіх удзельнікі семінара вывучылі праблемы стварэння новых тыпаў і мадэляў сучасных клубаў. Работнікі органаў і ўстаноў культуры шукаюць шляхі да паляпшэння зместу і форм сацыякультурнай дзейнасці насельніцтва, больш дакладна прыстасоўваюць дзейнасць сваіх клубаў да рэальных умоў.

Толькі ў дзяржаўнай сістэме ўстаноў клубнага тыпу налічваецца больш за 40 розных мадэляў і варыянтаў арганізацыйна-структурнага рэфармавання клуба. Атрымалі шырокае развіццё цэнтры фальклору і дамы народных промыслаў, дамы рамёстваў і цэнтры культуры і адпачынку, дамы сацыяльна-культурных паслуг і клубы-музеі, сацыяльна-культурныя цэнтры і г.д.

Практыка стварэння ўстаноў культуры новага тыпу і прафілізацыі клубаў сведчыць, што іх дзейнасць у новым выглядзе ў значнай ступені дазваляе больш уважліва ставіцца да інтарэсаў грамадзян, а таксама больш рацыянальна выкарыстоўваць наяўную базу, сродкі, творчыя і інфармацыйныя рэсурсы і г.д. Адначасова вопыт функцыянавання такіх устаноў патрабуе свайго больш дакладнага вывучэння, тэарэтычнай, прававой інфармацыйна-метадычнай і кадравай забяспечанасці. Так, на Міншчыне даволі паспяхова працуюць у сельскай мясцовасці Дом пенсіянераў, Народны дом, Дом фларыстыкі, Дом-майстэрня і інш. Віцебшчына вызначаецца сёння значнай колькасцю дамоў рамёстваў, якія атрымалі ў грамадстве высокую адзнаку сваёй дзейнасці. Сярод устаноў культуры Гомельскай вобласці можна назваць Дом народнай медыцыны, Клуб вясковых сустрэч; атрымалі развіццё клубы сацыяльна-культурных паслуг і інш. Ёсць прыклады пераўтварэн-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня клубаў на Магілёўшчыне і Гродзеншчыне. Спроба стварэння новых устаноў культуры — маладзёжных цэнтраў, цэнтраў культуры і народных традыцый — прысутнічае ў Брэсцкай вобласці. Аналіз сучасных працэсаў у дзейнасці клубных устаноў у розных рэгіёнах рэспублікі дае падставу лічыць, што рэфармаванне клуба ў агульных рысах ідзе па наступных лініях:

— ад клуба — цэнтра ідэалагічнай работы да клуба — цэнтра развіцця нацыянальнай культуры ва ўсіх яе відах, формах праяўлення і бытавання;

— ад клуба — уніфікаванай установы з рэгламентаваным рэжымам сацыяльна-творчай актыўнасці да клуба — шматфункцыянальнай, многапрофільнай установы, прыстасаванай да ладу жыцця насельніцтва рэгіёна яе функцыянавання;

— ад клуба — установы, якая прызначана фарміраваць асобу па нейкаму «сацзаказу» ці ідэалагічнаму арыенціру да клуба, які стварае ўмовы для духоўнага і фізічнага станаўлення асобы ў адпаведнасці з яе самасвядомасцю, самабытнасцю і унікальнасцю;

— ад клуба, які праводзіць мерапрыемствы «па святочных днях» да клуба, які здольны рэагаваць на штодзённыя клопаты і праблемы свайго асяроддзя і можа прапанаваць кожнай сацыяльна-дэмаграфічнай, прафесіянальнай, узроставай групе неабходны набор культурных паслуг, пэўныя праграмы згодна патрабаванням і інтарэсам;

— ад клуба, накіраванага на выкананне «глабальных» планаў і праграм, да клуба, прызванага, у першую чаргу, ахоўваць, падтрымліваць і распаўсюджваць нацыянальна-культурныя каштоўнасці, традыцыйныя ўзоры народнай творчасці, зберагаць культурную спадчыну і садзейнічаць натуральнаму існаванню нацыянальнага мастацтва і сучасных форм мастацкай дзейнасці.

Асноўнымі шляхамі рэфармавання з'яўляюцца:

— прафілізацыя ці спецыялізацыя клубаў па асобных напрамках дзейнасці;

— укараненне мэтавых і рэгіянальных праграм з падпарадкаваннем функцый клуба іх мэтам;

— стварэнне прынцыпова новых устаноў культуры клубнага тыпу.

Вышэй пазначаныя пазіцыі амаль цалкам пацвярджаюцца практыкай функцыянавання ўстаноў культуры Ма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ладзечанскага і Вілейскага раёнаў. Аналізуючы вопыт Маладзечанскага раённага цэнтра рамёстваў в.Красоўшчына, Маладзечанскага цэнтра эстэтычнага выхавання дзяцей і падлеткаў, Вілейскага раённага цэнтра эстэтычнага выхавання, Народнага дома в.Талуць, Дома майстроў в.Каловічы, а таксама Любанскага адукацыйна-культурнага цэнтра, можна зрабіць наступныя высновы:

— у сельскіх рэгіёнах даволі актыўна ідзе пошук новых мадэляў сучаснага клуба, тыпаў мона- і шматпрофільных устаноў культуры і вольнага часу, а таксама новых падыходаў да арганізацыі іх дзейнасці;

— адбываецца пэўная рэабілітацыя клубнай установы, якая ўсё больш набывае прыкметы часу і будуе сваю дзейнасць, зыходзячы з патрэб асяроддзя, ідучы ад ладу жыцця вяскоўцаў, ад традыцый і звычаяў;

— установы культуры сельскіх рэгіёнаў усё больш адпавядаюць свайму сацыяльнаму прызначэнню як дэпалітызаваныя, грамадска-дзяржаўныя інстытуты культуры і дэмакратычны, агульнадаступны, гуманітарна-зарыентаваны сацыяльны арганізм;

— у параўнанні з мадэллю клубаў 70—пач.90-х гг. клуб сельскага рэгіёна — адносна самастойная ўстанова, якая паступова набывае свой асабісты твар, сваю непаўторнасць і прывабнасць праз арыгінальныя праграмы, рэгіянальна-адметныя прыкметы і формы сацыяльна-культурнай дзейнасці;

— клубная ўстанова ўсё больш падпадае пад параўнанне «клубаў у клубе», бо значная колькасць клубных фарміраванняў розных кірункаў мастацка-творчай дзейнасці, культурна-аматарскай і інш. прадстаўлена амаль у кожнай установе культуры пазначаных раёнаў;

— клубная установа ў рэгіёне выступае ў ролі своеасаблівай сацыяльнай сваццi, якая арганізуе духоўныя зносіны паміж людзьмі з аднолькавымі інтарэсамі, патрабаваннямі. Садзейнічае аб'яднанню розных груп у адзіны сацыяльны круг, забяспечваючы пры гэтым суб'ектна-аб'ектную мадэль узаемадзеяння;

— не можа існаваць адзінай, унікальнай мадэлі клубнай установы на вёсцы, бо кожны клуб унікальны ў сваім сацыяльна-культурным асяроддзі, яго функцыі вызначаюцца мясцовымі ўмовамі, наяўнасцю матэрыяльных, кадравых і інфармацыйных рэсурсаў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— працэс рэфармавання клубных установ па шляху адпаведнасці сацыяльна-эканамічным умовам адбываецца больш актыўна і плённа там, дзе назіраецца паслядоўная, сістэмная і мэтанакіраваная дзейнасць у гэтым кірунку раённых органаў культуры і метадычных структур, дзе вызначаецца пэўная пазіцыя кіраўніцтва органаў культуры ў правядзенні дзяржаўнай культурнай палітыкі.

Пры аналізе вопыту Любанскага адукацыйна-культурнага цэнтра вызначаецца неабходнасць пленнага ўзаемадзеяння ўстаноў і арганізацый розных ведамстваў у справе вырашэння шматлікіх праблем у развіцці культуры беларускай вёскі. Безумоўна, практыка стварэння такога цэнтра выклікае мноства пытанняў прававога, фінансавага, арганізацыйна-творчага характару. Сапраўды, што мы сёння шукаем, вывучаючы шляхі ўдасканалення дзейнасці сучаснай установы? Новы змест яе дзейнасці? Вызначаем новыя функцыі? Выдзяляем больш значныя для сучаснага перыяду прыярытэты дзейнасці? Ці наогул распрацоўваем новы тып установы, адмаўляючы сталай традыцыі ў яго існаванні? А, можа, галоўнае — вызначыць тыя структуры, тыя сучасныя мадэлі, якія з'яўляюцца жыццяздольнымі, адпавядаюць сацыяльнаму заказу з боку дзяржавы і адначасова грамадскім патрабаванням? Ці мэтазгодна аб'ядноўваць сёння функцыі клубнай установы і сярэдняй школы ў адзіную структуру? А калі аб'ядноўваць, як захаваць функцыі кожнага суб'екта сумеснай сацыякультурнай, адукацыйна-культурнай дзейнасці? Тут шмат пытанняў, якія патрабуюць глыбокага, разгорнутага даследавання з прыцягненнем шырокага кола спецыялістаў сферы адукацыі, культуры, эканомікі і юрыспрудэнцыі і інш.

Але ўжо сёння можна сцвярджаць, што пры будаўніцтве фундамента развіцця культуры беларускай вёскі неабходна абапірацца на наступныя асноўныя арганізацыйныя прынцыпы:

— каардынацыя (узгадненне, устанаўленне мэтазгодных суадносін паміж усімі суб'ектамі арганізацыі культурнай дзейнасці);

— кансалідацыя (аб'яднанне намаганняў спецыялістаў, розных устаноў і арганізацый сучаснай вёскі для ўзмацнення, павышэння эфектыўнасці дзейнасці ў справе ажыццяўлення культурных праграм);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— канцэнтрацыя (засяроджванне творчых, кадравых, фінансавых і іншых рэсурсаў і сродкаў на выкананне найбольш важных праграм і прыярытэтных панпрамкаў культурнага жыцця вёскі);

— комплекснасць (сукупнасць усіх суб'ектаў культурнай дзейнасці, суадноснасць і паслядоўнасць дзеянняў па агульных планах праграмы сацыяльна-культурнага развіцця рэгіёна; узаемасувязь паміж арганізацыямі і ўстановамі, што функцыянуюць у сацыяльна-бытавой, сацыякультурнай, сацыяльна-выхаваўчай і інш. сферах, нават аб'яднанне і злучэнне функцый).

Трэба дадаць, што ў сучасны перыяд практыка дэманструе мэтазгоднасць стварэння сацыяльна-культурных комплексаў, ці ў нейкім сэнсе аднаўляе ідэю комплекснага вырашэння праблем культуры беларускай вёскі, якая, на жаль, не атрымала свайго магчымага развіцця ў мінулыя дзесяцігоддзі. Не аналізуючы глыбока прычыны малой эфектыўнасці ідэі КСК у рэспубліцы, можна толькі канстатаваць: вульгарны падыход да развіцця КСК, паўсюднае іх навязванне і ўкараненне «зверху» не магло прынесці плённых вынікаў. Адсутнасць заканадаўчай базы, незацікаўленасць мясцовай улады — усё гэта не спрыяе станаўленню нават мэтазгодных структур і грамадскіх утварэнняў.

Сучасная сістэма клубных устаноў (уключаючы дзяржаўныя, прафсаюзныя і ведамасныя) складалася на працягу дзесяцігоддзяў і, зразумела, патрабуе рэфармавання і аднаўлення. Але ломка пэўных стэрэатыпаў у дзейнасці гэтых структур павінна адбывацца з улікам дасягненняў у іх сацыякультурнай практыцы таго пазітыўнага вопыту і грамадскіх пазіцый, якія даказваюць сёння сваю адпаведнасць часу і жыццяздольнасць. Трэба разумець, што рэчаіснасць патрабуе пэўных функцыянальных змен у дзейнасці ўстаноў культуры клубнага тыпу, не знешніх рэформ, а адпаведнай перабудовы клубных функцый і новых унутраных сувязяў паміж імі. Толькі ўлічваючы тое, да чаго прызвычаіліся людзі за дзесяцігоддзі, тыя ці іншыя формы сацыяльных паводзін ва ўмовах вольнага часу, мадэлі грамадскіх зносін у сферы культуры, можна напоўніць прынцыпова новым зместам сацыякультурнае жыццё рэгіёна. Не адмаўляючы таго, што сетка дзяржаўных устаноў культуры клубнага тыпу патрабуе свайго ўдасканаль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання, нельга пад уплывам складанага эканамічнага моманту згубіць усё набытае, бо аднавіць разбуранае будзе проста немагчыма.

Практыка сведчыць, што альтэрнатывы клубу, як сацыяльнаму інстытуту культуры, асабліва ў сельскіх рэгіёнах, сёння не існуе. Тут паўстае яшчэ адно пытанне аб магчымасцях рэарганізацыі і рэфармавання сельскіх клубных устаноў суадносна з тымі працэсамі прафілізацыі і спецыялізацыі клубаў, што актыўна ажыццяўляюцца ў гарадах і гарадскіх пасёлках рэспублікі.

Сельскі клуб — гэта адзіная ўстанова ў вясковым асяроддзі, якая выконвае шэраг сацыяльна-культурных функцый, адпавядаючы патрэбам насельніцтва ў адпачынку, святочнай дзейнасці, далучэння да норм культурнага жыцця, арганізацыі духоўных зносін па-за бытавой традыцыяй. Безумоўна, вясковы лад жыцця дае дастатковую магчымасць мець неабходны аб'ём кантактаў і зносін паміж вяскоўцамі. Але не трэба забывацца, што ў вясковы лад жыцця ўсё больш пранікае элементаў гарадской культуры, да таго ж носьбітамі гэтай культуры выступае мясцовая інтэлігенцыя, часткова моладзь і падлеткі, якія імкнуцца мець пэўны ўзровень культурных кантактаў праз сацыяльныя мадэлі паводзін, больш арганічных у гарадскім ладзе жыцця. Карацей кажучы, сельскі клуб выконвае значную колькасць функцый, галоўнымі з якіх яўляюцца: цывілізаваны адпачынак, падтрымка форм натуральнага існавання народнай творчасці, святочна-бытавыя традыцыі, садзейнічанне ў вырашэнні сацыяльных, экалагічных, псіхалагічных і іншых праблем асяроддзя.

Сельскі клуб, такім чынам, бачыцца многафункцыянальнай установай культуры, якая каардынуе культурнае жыццё свайго рэгіёна, ажыццяўляе дзяржаўную культурную палітыку, аб'ядноўвае дзеля рэалізацыі сацыякультурных праграм іншыя арганізацыі і ўстановы розных сфер і ведамстваў. Вузкая прафілізацыя сельскіх клубаў магчыма ў тым выпадку, калі шэраг функцый бяруць на сябе іншыя сацыяльныя інстытуты рэгіёна. Так, стварэнне сельскага Дома рамёстваў патрабуе перанясення некаторых функцый па арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці да іншых устаноў і арганізацый. Напрыклад, арганізацыю культурна-забаўляльнай дзейнасці моладзі і адпачынку бярэ на сябе сярэдняя школа ці іншая структура. Падтрымка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

норм культурнага жыцця патрабуе перагляду сацыяльных функцый усёй інфраструктуры сферы культуры населенага пункта. Толькі на аснове такога культуралагічнага аналізу мэтазгодна перапрафілізацыя клуба. Патрэбна не губляць функцыі арганізатара культурнага жыцця, а знаходзіць больш адпаведныя мясцовым умовам структурныя выра-шэнні.

Можа, і небяспрэчнай падаецца думка, што большасць сельскіх клубаў не патрабуе спецыялізацыі ці прафілізацыі. Але справа ў іншым. Якасць культурных праграм, узровень святочна-абрадавых мерапрыемстваў, змест і формы забаўляльнай дзейнасці і другіх клубных дзеянняў далёка не задавальняюць сельскіх жыхароў, не адпавядаюць іх уяўленням аб нормах культурнага жыцця вёскі.

Што датычыцца распрацоўкі і ўкаранення на практычным узроўні прынцыпова новых мадэляў устаноў культуры клубнага тыпу, то неабходна ў першую чаргу вызначыць месца і сацыяльную ролю гэтых структур у сістэме рэгулявання і каардынацыі сацыякультурных працэсаў рэгіёна побач з іншымі сацыяльнымі інстытутамі культуры (музеямі, бібліятэкамі, навучальнымі установамі, цэнтрамі эстэтычнага выхавання і інш.). Гэта дазволіць акрэсліць больш дакладна спецыфічныя функцыі клубнай установы, выявіць аптымальныя арганізацыйна-структурныя падыходы да стварэння новых мадэляў, запатрабаваных у дадзеных умовах і адпавядаючых сацыяльнаму заказу.

Аптымальныя мадэлі ўстаноў культуры клубнага тыпу, як гэта бачыцца, павінны адпавядаць мэтам і ідэалам развіцця нацыянальнай культуры і адначасова адлюстроўваць рэальныя магчымасці і рэсурсы на бліжэйшы перыяд. У канцэнтраваным выглядзе мадэль клуба — гэта сацыяльныя мэты і функцыі культуры ў рэальным стане і дакладных умовах яе развіцця. Наогул у тэарэтычнай мадэлі клуба як сацыяльнага інстытута абавязкова павінна вызначацца сутнасць сучаснай сацыякультурнай дзейнасці, якая ажыццяўляецца ва ўмовах вольнага часу, адпаведнасць рэчаіснасці ва ўсёй яе эканамічнай, палітычнай і грамадска-культурнай складанасці, наяўнасць агульных арыенціраў і перспектыўных ліній развіцця гэтай мадэлі на будучыню.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Практыка вымагае ад навукоўцаў абгрунтаваных праектаў развіцця сацыякультурнай сферы з улікам рэгіянальных, культурна-гістарычных, нацыянальна-этнічных асаблівасцей, дыктуе неабходнасць навукова-метадычных распрацовак на стварэнне розных тыпаў устаноў культуры і мадэляў іх дзейнасці суадносна разнастайнасці інтарэсаў і запатрабаванняў розных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва. Зразумела адно: у грамадстве пастунова разбураецца стэрэатып поглядаў на клуб як на дах для правядзення мерапрыемстваў для клубнай справаздачы.

Задавальненне культурных запытаў і інтарэсаў насельніцтва было і будзе надалей адной з галоўных функцый дзяржаўных устаноў культуры клубнага тыпу. Таму веданне рэальных запатрабаванняў насельніцтва вызначаецца спецыялістамі галіны ў якасці найважнейшага арыенціру ў культурнай палітыцы ў дзейнасці клуба будучыні. Неабходнасць пастаяннага вывучэння духоўных арыенціраў, інтарэсаў і патрабаванняў аўдыторыі, якія павінны быць задаволены непасрэдна ў сферы вольнага часу, вымагае спецыяльных сацыялагічных даследаванняў.

Улічваць і адпаведным чынам выкарыстоўваць такія фактары, як узровень развіцця, наяўнасць пэўнага сацыяльнага вопыту, узровень умовы працы і быту насельніцтва, наогул сацыяльную базу рэгіянальнай культуры — гэта тая прафесійная мэта, якой павінны кіравацца работнікі культуры, каб забяспечыць належны стан дзейнасці клуба ў наступным стагоддзі.

Зразумела, што вывучэнне асяроддзя, інтарэсаў, культурных запытаў само па сабе не гарантуе ўдасканальвання дзейнасці ўстановы. Толькі пастаянны ўлік сітуацыі, рэгулярны аналіз грамадскай ацэнкі дзейнасці садзейнічае аператыўнаму рэагаванню клуба на сацыяльна-творчы заказ праз пэўныя рэгіянальныя культурныя праграмы і асобныя мерапрыемствы. Веданне асяроддзя, асноўных арыенціраў насельніцтва ў сферы вольнага часу дазволіць больш дыферэнцыравана і дакладна будаваць жыццё клубнай установы.

Аналіз практыкі, сацыялагічныя даследаванні сведчаць, што пры наяўнасці агульных тэндэнцый у сферы вольнага часу развіццё розных формаў культурнай дзейнасці ў рэгіянальным плане адбываецца неаднолькава. Вызначэнне прыярытэтных напрамкаў развіцця нацыяналь-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най культуры, пошук і ўкараненне новых праектаў і мадэляў сацыяльна-культурнага жыцця насельніцтва асабліва актуальна на рэгіянальным узроўні. Відавочна, што менавіта ў рэгіёне сёння складаецца ўласная стратэгія развіцця сферы вольнага часу з улікам сацыяльна-эканамічных і культурна-гістарычных асаблівасцей раёна, культурнага патэнцыялу, патрабаванняў і інтарэсаў грамадзян.

Для ажыццяўлення рэгіянальнай культурнай палітыкі актуальным сёння з'яўляецца вызначэнне метадаў рэгулявання культурнымі працэсамі на ўзроўні рэгіёна, адпавядаючых мэтам дэцэнтралізацыі і дэмакратызацыі ўпраўлення. Можна канстатаваць, што апошнім часам значна актывізавалася ў гэтым кірунку дзейнасць упраўленняў культуры аблвыканкомаў, абласных цэнтраў народнай творчасці і арганізацыйна-метадычных структур рэспублікі. Распрацоўка канцэпцыі развіцця сацыякультурнай сферы і адпрацоўка сістэмы метадаў кіравання выступаюць сёння найбольш надзённымі задачамі, у ажыццяўленні якіх галоўная роля належыць дзяржаўным органам культуры непасрэдна ў рэгіёнах. Вынікам укаранення рэгіянальнай праграмы сацыякультурнага развіцця рэгіёна можа быць стварэнне новага тыпу ўстановы культуры, ці яе пэўная спецыялізацыя па аднаму з напрамкаў развіцця нацыянальнай культуры. Прыкладам такога падыходу да рэфармавання клубаў праз рэгіянальныя мэтавыя праграмы можа быць вопыт упраўлення культуры Мінаблвыканкома і Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці.

Нельга не падкрэсліць, што шматлікія прававыя і матэрыяльна-фінансавыя праблемы застаюцца па-ранейшаму актуальнымі для дзейнасці большасці сельскіх клубных устаноў і цэнтраў культуры раёнаў і гарадоў рэспублікі. Дзяржаўны бюджэт павінен застацца адной з галоўных крыніц фінансавання клубаў, але далейшае іх развіццё абавязкова патрабуе пашырэння эканамічных крыніц і каналаў, уключаючы камерцыйныя паслугі, спецыялізаваныя фонды, долевы ўдзел прамысловых структур, фундатарства і г.д. Што датычыцца арганізацыйна-прававой базы, то ўся дзейнасць клубаў будучыні павінна ажыццяўляцца на асновах добраахвотнасці, самакіравання, ініцыятывы, уліку культурна-гістарычных, этнарэгіянальных традыцый, дыферэнцыяцыі і спецыялізацыі. Клубныя ўстановы могуць абіраць розныя напрамкі дзейнасці і ў за-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лежнасці ад мясцовых умоў, патрабаванняў насельніцтва, матэрыяльных, кадравых і інфармацыйных рэсурсаў вызначаць свой профіль і спектр сацыяльна-культурных паслуг для насельніцтва. З'яўляючыся юрыдычна самастойнымі ўстановамі, клубы будучыні павінны мець самыя розныя фінансава-эканамічныя мадэлі і механізмы кіравання.

Пад кантролем дзяржавы павінна ажыццяўляцца пэўная кадравая палітыка, бо лёс клуба XXI стагоддзя, як сведчаць выказванні вядучых спецыялістаў культурнай сферы вольнага часу, вызначаецца узроўнем прафесійнай падрыхтоўкі работнікаў культуры і агульнай іх накіраванасцю на рашэнне надзённых праблем народнай творчасці і клубнай дзейнасці. Дзяржаўная культурная палітыка ў рэгіёнах адносна клубнай установы, як гэта бачыцца, павінна ажыццяўляцца па наступных напрамках:

— захаванне па магчымасці сучаснай сеткі дзяржаўных клубных устаноў з вызначэннем іх асноўных задач і прыярытэтаў ў дзейнасці па развіццю нацыянальнай беларускай культуры;

— рацыянальнае выкарыстанне сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры і матэрыяльна-фінансавых сродкаў на іх утрыманне;

— узнаўленне творчых рэсурсаў розных сацыяльна-прафесійных, дэмаграфічных і этнічных груп насельніцтва рэгіёна;

— стабілізацыя кадравага патэнцыялу сацыяльна-культурнай сферы (у першую чаргу — сельскіх устаноў культуры);

— далейшая распрацоўка канцэптуальных асноў і перспектыў развіцця клубнай установы на будучыню;

— вызначэнне ў якасці асноўных паказчыкаў у дзейнасці клубнай установы наступных крытэрыяў: умацаванне фізічнага здароўя людзей, развіцце іх духоўнай культуры; вырашэнне сацыяльна-псіхалагічных, грамадска-культурных праблем рэгіёнаў функцыянавання клуба і інш.

Сацыялагічныя даследаванні Беларускага інстытута праблем культуры, аналіз практыкі статыстычных даных, вынікі работы семінара кіраўнікоў органаў культуры рэспублікі даюць падставу для пэўнага прагнозу: клубная ўстанова будучыні — сацыяльны інстытут, які будзе садзейнічаць духоўнаму і фізічнаму развіццю грамадзян,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

задавальненню і фарміраванню культурных запатрабаванняў розных катэгорый насельніцтва рэспублікі. Фукцыянуючы у сферы вольнага часу, клубныя установы прызначаны арганізоўваць вольны час, самадзейную творчасць і гульнёва-забаўляльныя зносіны. У гэтым іх першачарговае прызначэнне.

Клуб — гэта ўстанова, якая павінна арганізаваць сацыяльна-культурную дзейнасць насельніцтва рэгіёна, зоны абслугоўвання. Гэтая яго роля будзе паступова ўзрастаць і замацоўвацца ў грамадскім жыцці.

Дзейнасць клубных устаноў усё больш павінна быць накіравана на зберажэнне, захаванне і распаўсюджванне ўзораў народнай творчасці ва ўсіх яе відах і формах праяўлення. Клуб будучыні, такім чынам, бачыцца ўстановай, якая адначасова выступае ў якасці:

— сацыяльна-арганізаванай прасторы духоўнага станаўлення асобы, арганізатара і завадатара святочна-відовішчных праграм;

— каардынатара культурнага жыцця;

— цэнтра развіцця рэкрэацыйнай культуры грамадства;

— творчай лабараторыі мастацкай самадзейнасці ва ўсіх яе відах і жанрах;

— акумулятара культурнай актыўнасці насельніцтва рэгіёна.

І апошняе. Далейшае ўдасканаленне дзейнасці клубных устаноў, як ва ўмовах гарадской, так і сельскай культуры, не прадстаўляецца магчымым без усебаковага аналізу сучаснага стану клубнай практыкі, вывучэння тых працэсаў і рухаў, якія адбываюцца ў дзейнасці клуба як сацыяльнага інстытута нацыянальнай культуры. Уся дзейнасць па сацыяльна-культурнаму пераўтварэнню клубных устаноў рэспублікі павінна быць пастаўлена на адпаведную навукова-тэарэтычную базу.

*Макарава А.А., старшы выкладчык кафедры менеджменту сацыякультурнай сферы Беларускага універсітэта культуры*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ